Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

3 ЧЭРВЕНЯ 2023 г. СУБОТА

№ 105 (29985)

ШТО РЫХТУЕ ФЕСТЫВАЛЬ «МАЛАДЗЕЧНА-2023» 6

УРОКІ ПАНДЭМІІ 8

ЗА СЛОВАМІ — КАНКРЭТНЫЯ СПРАВЫ

Прэзідэнт падпісаў распараджэнне па выніках нарады аб сістэме аховы здароўя

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў распараджэнне «Аб павышэнні эфектыўнасці работы сістэмы аховы здароўя», паведамілі БелТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Па выніках нарады, якая адбылася 23 мая 2023 года, кіраўніком дзяржавы дадзены канкрэтныя даручэнні аб навядзенні парадку ва ўстановах аховы здароўя ўсіх узроўняў, стварэнні ўмоў для аказання якаснай медыцынскай дапамогі насельніцтву. Пры гэтым асаблівая ўвага павінна ўдзяляцца вясковым жыхарам.

На старшынь мясцовых органаў улады ўскладзена персанальная адказнасць за санітарна-тэхнічны стан будынкаў і збудаванняў устаноў аховы здароўя.

Міністэрству аховы здароўя дадзены даручэнні аб пераглядзе нарматыўных прававых актаў, якія рэгулююць медыцынскую і фармацэўтычную дзейнасць, аказанне платных медыцынскіх паслуг, з улікам правапрымяняльнай практыкі.

У прыватнасці, неабходна скарэкціраваць парадак дыспансерызацыі насельніцтва, скараціць тэрміны чакання высокатэхналагічных аперацыйных умяшанняў і дыягнастычных даследаванняў.

Даручана прыняць дадатковыя меры па вырашэнні праблемы недахопу медыкаў, найбольш востры дэфіцыт якіх назіраецца ў сельскай мясцовасці, павышэнні якасці іх падрыхтоўкі і замацаванні на працоўных месцах. Будзе перагледжаны парадак налічэння заработнай платы медработнікам з павелічэннем долі службовага акладу.

Дадзены даручэнні па забеспячэнні распрацоўкі новых запатрабаваных медыкаментаў, павелічэнні аб'ёмаў вытворчасці і пашырэнні наменклатуры айчынных лекавых прэпаратаў, а таксама ўдасканаленні сістэмы кіравання фармацэўтычнай галіной.

Сфарміраваная Прэзідэнтам міжведамасная рабочая група да канца года прадоўжыць праверку сістэмы аховы здароўя, у тым ліку маніторынг вырашэння выяўленых праблемных пытанняў.

Даклады аб выніках праведзенай работы будуць прадстаўлены кіраўніку дзяржавы ў студзені 2024 года.

Аляксандр Лукашэнка ў студзені 2024 года (пасля навагодніх і калядных свят) збярэ вялікую нараду па ахове здароўя, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. З улікам даручэння да 1 студзеня навесці парадак у галіне і вырашыць усе праблемы, на маючай адбыцца вялікай нарадзе спытаюць па кожным пункце.

«Што датычыцца падпісанага распараджэння, кантроль за ходам яго выканання будзе арганізаваны самы сур'ёзны. Прэзідэнт звяртае ўвагу, што недахопы павінны ліквідавацца ўжо цяпер», — падкрэслілі ў прэс-службе. Было адзначана, што арганізаваць вельмі сур'ёзную працу павінны не чакаючы снежня.

КАБ НЕ ДЗЕЛЯ «ПТУШАЧКІ»...

Учора Наталля Качанава правяла асабісты выязны прыём грамадзян у Пастаўскім райвыканкаме Віцебскай вобласці. Са зваротамі да старшыні Савета Рэспублікі ў паўночны рэгіён прыехалі людзі з Гомельскага, Дзяржынскага, Полацкага, Віцебскага і іншых раёнаў. На парадку дня былі цікавыя і нетыповыя праблемы.

Разам з Наталляй Іванаўнай людзей выслухоўваў старшыня Пастаўскага райвыканкама Сяргей Чэпік, а таксама прадстаўнікі галіновых міністэрстваў. Шэраг пытанняў, з якімі звярталіся людзі падчас асабістага прыёму, датычыліся работы сістэмы аховы здароўя. Сям'я з Ваўкавыскага раёна распавяла трагічную гісторыю. Жанчына, жонка і маці двух дзяцей, ва ўзросце 66 гадоў трапіла ў цэнтральную раённую бальніцу з тэмпературай і болем у жываце. Праз 10 дзён жанчына памерла ад перытаніту. Урачы дыягнаставалі камяні ў жаўцяку, зрабілі аперацыю, але надта позна.

Урач-гігіеніст з 10-гадовым вопытам работы ў Дзяржынскім раённым цэнтры гігіены і эпідэміялогіі прыехаў на прыём Наталлі Качанавай з прапановамі па аптымізацыі работы сістэмы аховы здароўя. Ён мае ідэі па папулярызацыі абавязковай дыспансерызацыі. Ён нагадаў, што ўсім людзям працаздольнага ўзросту неабходна штогод праходзіць медыцынскі агляд, на які сёння на працоўным месцы даюць выхадны дзень.

СТАР. 2

А Ў ВАС КАВУНЫ РАСТУЦЬ?

Фота БелТА.

Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі, механізатар Мікалай БЕЛАКУРСКІ, які працуе ў вядомым на ўсю краіну ААТ «Рассвет імя К. П. Арлоўскага», гэтымі днямі разам з калегамі заняты незвычайнай для Беларусі справай. Яны па адмысловай тэхналогіі высаджваюць у адкрыты грунт кавуны. Прычым, можна сказаць, у прамысловых маштабах — на тутэйшай бахчы належыць высадзіць 40 тысяч каліў расады.

ЦЫТАТА ДНЯ

Андрэй ІВАНЕЦ, міністр адукацыі:

«Цяпер скончыла работу міжведамасная камісія, якая правярала карэктнасць падліку вынікаў першага цэнтралізаванага экзамену. Вынікі праверкі паказалі, што памылак няма, у тым ліку і ў методыцы разліку тэставых балаў. Разам з тым па колькасці зваротаў, якія да нас паступілі ад грамадзян, стала відавочна, што методыка занадта складаная, таму Прэзідэнтам нашай краіны Аляксандрам Лукашэнкам дадзена канкрэтнае даручэнне — спрасціць методыку разліку і зрабіць яе зразумелай для кожнага чалавека. Міністэрствам адукацыі такая работа праведзена, у яе распрацоўцы выкарыстоўваліся падыходы, якія прымяняліся пры правядзенні рэпетыцыйнага тэсціравання. Будуць пералічаны вынікі першага цэнтралізаванага экзамену і сёння ж размешчаны на сайце РІКВ, а таксама ў асабістых кабінетах абітурыентаў. Вынікі другога ЦЭ таксама будуць разлічаны па гэтай жа методыцы, іх можна будзе даведацца ў панядзелак».

Эксклюзіўнае інтэрв'ю

Ёсць прырода — ёсць жыццё!

5 чэрвеня штогод адзначаецца Сусветны дзень аховы навакольнага асяроддзя. Напярэдадні адной з найважнейшых дат экалагічнага календара карэспандэнт «Звязды» сустрэўся з кіраўніком прыродаахоўнага ведамства Андрэем ХУДЫКАМ.

— Андрэй Паўлавіч, доўгі час людзі ўспрымалі прыроду як дадзенае, нешта самадастатковае, і стаўленне было, як той казаў, спажывецкае. Аднак рэаліі аказаліся іншымі. На пэўным этапе антрапагенны прэс стаў настолькі відавочным і істотным, што ігнараваць змяненні, якія адбываюцца ў навакольным асяроддзі, ужо стала проста небяспечна для самога чалавека. Праблема набыла глабальны характар. Што ж робіцца ў нашай краіне ў мэтах захавання прыроды?

— Узаемасувязь і ўзаемазалежнасць чалавека і прыроды відавочныя, таму беражлівыя адносіны да прыроды з'яўляюцца залогам самога жыцця на Зямлі. Ахова і паляпшэнне стану навакольнага асяроддзя — вось найважнейшая мэта чалавецтва, і цяжар адказнасці за яе дасягненне ляжыць на чалавеку, урадах і цэлых супольнасцях дзяржаў.

СТАР. 3

Прыёмная кампанія — 2023

«ПРАФЕСІЯ НАСТАЎНІКА — НЕ ДЛЯ РАЎНАДУШНЫХ ЛЮДЗЕЙ»

Сярод абітурыентаў БДПУ ёсць прадстаўнікі педагагічных дынастый у сёмым пакаленні

З якіх кампанентаў складаецца імідж педагога? Як вы разумееце тэзіс пра тое, што педагог — гэта лідар? Назавіце якасці, якія перашкаджаюць эфектыўнай прафесійнай дзейнасці педагога... Да якіх наступстваў могуць прыводзіць яго памылкі? Назавіце плюсы і мінусы педагагічнай прафесіі. Што цікавага вы можаце расказаць іншаземцу пра сістэму адукацыі ў нашай краіне? Адказаць на гэтыя і многія іншыя пытанні было прапанавана выпускнікам профільных педагагічных класаў, якія пажадалі стаць студэнтамі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта і навучацца там на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі. У першы дзень лета па ўсёй краіне стартаваў надзвычай важны этап уступнай кампаніі — прыёмныя камісіі пачалі прыём дакументаў на мэтавыя месцы, які прадоўжыцца да 5 чэрвеня. У БДПУ, напрыклад, пад мэтавую падрыхтоўку выдзелена сёлета 293 месцы — на трэць больш, чым летась.



СТАР. 3

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Расія будзе дамагацца сваёй бяспекі, што выключае ўступленне Украіны ў Паўночнаатлантычны альянс

Аб гэтым заявіў прэс-сакратар расійскага лідара Дзмітрый Пяскоў, паведамляе ТАСС. Гэтая тэма, паводле яго слоў, з'яўляецца раздражняльнікам на доўгія гады, і многія еўрапейскія краіны разумеюць гэта. Дзмітрый Пяскоў пракаментаваў агучаную напярэдадні ў Кішынёве просьбу ўкраінскага прэзідэнта Уладзіміра Зяленскага даць Кіеву членства ў НАТА. Па словах прадстаўніка Крамля, дадзеныя заявы дэманструюць нежаданне ўлад Украіны вырашаць канфлікт шляхам мірных перагавораў. Раней генеральны сакратар НАТА Енс Столтэнберг заявіў, што ўступленне Украіны ў альянс да заканчэння баявых дзеянняў на яе тэрыторыі немагчыма. Пры гэтым ён падкрэсліў, што нават «перамога на полі бою» не змагла б гарантаваць Кіеву ўступленне ў НАТА.

У Польшчы заявілі, што адмова падоўжыць забарону на экспарт збожжа з Украіны стане памылкай

Адмова Еўракамісіі прадоўжыць пасля 5 чэрвеня забарону на экспарт украінскага збожжа стане буйной памылкай. Такое меркаванне выказаў Польскаму агенцтву друку міністр сельскай гаспадаркі і развіцця сельскай мясцовасці Польшчы Роберт Тэлус. «Калі забарона [на вываз збожжа] не будзе прадоўжана, гэта стане вялікай еўрапейскай памылкай», — сказаў ён. Міністр дадаў, што «не хацеў бы палітычнай вайны з Еўракамісіяй», але з Бруселя даходзіць «трывожная інфармацыя» аб магчымасці адмены забароны. Тэлус растлумачыў, што пры такім развіцці падзей Варшава павінна будзе прыняць «аздараўленчыя меры, каб дапамагчы польскаму селяніну». 2 мая па рашэнні ЕК пачала дзейнічаць часовая забарона на пастаўкі ўкраінскіх пшаніцы, кукурузы, насення сланечніка і рапсу ў Балгарыю, Венгрыю, Польшчу, Румынію і Славакію, якія адмянілі ўведзеныя ў аднабаковым парадку абмежаванні на ўвоз аграрнай прадукцыі з Украіны. Тэрмін дзеяння забароны заканчваецца 5 чэрвеня.

Аб'ём мікрапластыку ў сусветным акіяне вырас у 18 разоў за апошнія шэсць гадоў

Звесткі апублікаваны праектам Ocean Race, у рамках якога навукоўцы аналізуюць пробы марской вады па ўсёй планеце. Паводле даных праекта, узровень забруджвання ў 18 разоў вышэйшы, чым у перыяд папярэдняй ацэнкі шэсць гадоў таму. «Вынікі, якія мы прааналізавалі на дадзены момант, адносяцца да другога і трэцяга этапаў ацэнкі, — распавядае аспірант Універсітэта Род-Айленда Вікторыя Фулфер. — Пробы бяруцца ў паўднёвай частцы Атлантычнага акіяна і ў Індыйскім. У гэтых раёнах мы бачым канцэнтрацыю мікрапластыку ў дыяпазоне ад 100 да 2000 часціц на кубічны метр вады».

КОРАТКА

- **Мінэнерга: гарадскі грамадскі транспарт Жодзіна і Шклова плануюць зрабіць выключна электрычным.**
- Амаль 30 тысяч інтэрнэт-крамаў зарэгістравана ў Беларусі на пачатак года.
- **Першы студатрадаўскі праект з удзелам каля 60 студэнтаў і навучэнцаў профільных медыцынскіх устаноў адукацыі з усёй Беларусі будзе рэалізаваны ў Наваполацку.**
- У Беларусі ўстаноўлены парадак вызначэння кошту будаўніцтва квадратнага метра жылога дома.
- **У Аляксандраўскім скверы каля Купалаўскага тэатра па суботах будуць праходзіць канцэрты.**

Адпачынак

КАБ БЫЛО СМАЧНА, БЯСПЕЧНА І НЯДОРАГА

Што робяць айчынныя прафсаюзы для камфортнага аздараўлення дзяцей

Летам у Беларусі будзе працаваць 5,9 тысячы дзіцячых лагераў, дзе, як мяркуецца, адпачне звыш 377 тысяч малых. Аздараўленчая кампанія для непаўналетніх, пачатку якой папярэднічала вялікая падрыхтоўчая работа, стартавала 1 чэрвеня. Як зрабіць пуцёўку для дзіцяці больш таннай і на што звяртаюць увагу пры падрыхтоўцы да пачатку сезона, расказалі спецыялісты Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі.

НА СПАРТПЛЯЦОЎЦЫ, У ПАКОІ, ДУШАВОЙ

Асаблівую ўвагу прафсаюзы аддаюць бяспецы знаходжання дзяцей у аздараўленчых установах і прафілактыцы траўматызму. Тэхнічная інспекцыя працы праводзіць праверку абсталявання дзіцячых гульнявых і спартыўных пляцовак, іх адпаведнасці стандартам бяспекі, стану ўсіх памяшканняў — ад пакояў адпачынку да душавых і сталовых.

— Мэта маніторынгу, які праводзіцца тэхнічнай інспекцыяй працы ў маі-ліпені ў лагерах з кругласутачным знаходжаннем і лагерах з дзённым прабываннем дзяцей сістэмы адукацыі, — упэўніцца, што ўмовы знаходжання дзяцей і працы персаналу адпавядаюць патрабаванням заканадаўства, — акрэсліла **Марына ЛЯСУН, галоўны тэхнічны інспектар працы Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі**. — Сярод найбольш частых парушэнняў — неналежны стан спартыўнага і гульнявога абсталявання, а менавіта тут дзеці могуць атрымаць большасць траўмаў. Згодна з патрабаваннямі новага ДАСТа па выпрабаванні і эксплуатацыі дзіцячага і гульнявога абсталявання, які ўступіў у сілу ў 2020 годзе, мы абследуем надзейнасць мацавання абсталявання, адсутнасць шчылін і іншых няспраўнасцяў, наяўнасць актаў абследавання на кожны від абсталявання (арэлі, каруселі, футбольныя вароты). З апошнім найбольшыя праблемы, ажно да смяротных выпадкаў.

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!